*12.* Спадчына акадэміка Яўхіма Карскага. Да 150-годдзя з дня нараджэння [Электронны рэсурс] / склад. : В. У. Скалабан, К. В. Суша ; пад агульнай рэд. Р. С. Матульскага [і інш.]. – Мінск : НББ, 2010. – 1 электр. апт. дыск (CD-ROM).

*13. Ткачоў, М.* Не згасне справа Каліноўскага / М. Ткачоў // Чырвоная змена. – 1989. – № 57. – 25 сакавіка. – С. 7.

*14. Цьвікевіч, І.* Кастусь Каліноўскі (к 60-годзьдзю яго сьмерці) : Біяграфічна-гістарычны нарыс / І. Цьвікевіч // Полымя. – 1924. – № 2. – С. 3–18.

В. І. ЯКАЎЧУК

# ДЗЕЙНАСЦЬ ОРГАНАЎ МЯСЦОВАГА КІРАВАННЯ ПА АДНАЎЛЕННІ МІРНАГА ЖЫЦЦЯ Ў СВІСЛАЦКІМ РАЁНЕ (1944–1950 гг.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У ліпені 1944 г. тэрыторыя Беларусі вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У выніку Беластоцкай аперацыі 17 ліпеня г. п. Свіслач быў ачышчаны ад ворага войскамі 2-га Беларускага фронту пад камандаваннем генерал-палкоўніка Г. Ф. Захарава. Першымі ў Свіслач увайшлі воіны 190-га стралковага палка 5-й стралковай Арлоўскай Чырвонасцяжнай ордэнаў Суворава і Кутузава дывізіі (камандзір палкоўнік Н. Т. Міхаліцын), якія і ўзнялі чырвоны сцяг над зруйнаваным пасёлкам [5, с. 248–250].

За гады вайны ў БССР было разбурана або вывезена ў Германію 10 338 прамысловых прадпрыемстваў. Агульныя страты, нанесеныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі дзяржаўнай прамысловасці Беларусі, склалі 6225 млн руб. (у цэнах 1941 г.). Ворагі спалілі і разбурылі больш за 200 гарадоў і райцэнтраў. Матэрыяльны ўрон, нанесены сельскай гаспадарцы рэспублікі, склаў 22 471,9 млн руб. Агульны матэрыяльны ўрон, нанесены фашыстамі эканоміцы і насельніцтву Беларусі, дасягнуў 75 млрд руб., што ў 35 разоў перавысіла дзяржбюджэт рэспублікі ў 1940 г. [3]. Але самай вялікай стратай было масавае знішчэнне насельніцтва. Больш за 2,2 млн чалавек знішчылі акупанты на тэрыторыі Беларусі, каля 380 тыс. жыхароў Беларусі вывезлі на катаргу ў Германію. У выніку колькасць рабочых

і служачых у эканоміцы БССР у 1945 г. была менш, чым у 1940 г. на 474 тыс., або на 53,5 % [2, с. 324].

Цяжкую спадчыну вайна пакінула і Свіслаччыне, 1162 ураджэнцы раёна не звярнуліся з фронту, 5213 мірных жыхароў загінулі ў час акупацыі, каля 500 чалавек вывезены ў Германію. У Свіслацкім раёне было знішчана 8 вёсак, на 95 % разбураны сам пасёлак. Поўнасцю былі разбураны знакамітыя свіслацкія брамы, 2 касцёлы, царква, 4 сінагогі, будынкі сярэдняй і трох сямігадовых школ, гарадскі парк, узарваны чыгуначны вакзал і вадакачка [5, с. 386–389].

Адразу пасля вызвалення Свіслачы і раёна адноўлена дзейнасць органаў савецкай улады, партыйных і камсамольскіх арганізацый. У гэты складаны час раёнам кіравалі першы сакратар райкома партыі Р. С. Лук'янаў і старшыня райвыканкама А. К. Завадскі. Усе свае сілы райком партыі і райвыканкам накіравалі на аднаўленне народнай гаспадаркі, разбуранай вайной, дапамогу жыхарам, забеспячэнне іх жыллём і прадуктамі. Уся арганізацыйная і масава-палітычная работа кіраўніцтва раёна праводзілася пад лозунгам «Усё для фронта! Усё для перамогі!». Мясцовыя жыхары разумелі сутнасць гэтага лозунгу і аказвалі пасільную дапамогу дзяржаве ў пастаўках хлеба, бульбы, аднаўленні транспарту, чыгункі і шасейных дарог. Да кожнай сям'і быў даведзены план па лесанарыхтоўцы і вывазу драўніны. Была адноўлена цагельня ў в. Ганчары, пабудаваная яшчэ ў XIX ст. Гэта дазволіла ўжо да лістападу 1946 г. скончыць перасяленне людзей з зямлянак у больш-менш прыгодныя для жыцця памяшканні.

Райком партыі і райвыканкам устанавілі жорсткі кантроль за выкананнем жыхарамі раёна абавязацельстваў па пастаўках дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі. За невыкананне дзяржаўных паставак старшыні сельсаветаў вызваляліся ад пасадаў, а да некаторых «злосных сабатажнікаў» прымаліся і больш жорсткія меры. Зразумела, што ўвесь цяжар па аднаўленні разбуранай вайной гаспадаркі ў першыя гады лёг на плечы жанчын, старых і падлеткаў, і тых, хто па стану здароў'я не прызываўся ў армію.

Вялікую дапамогу наступаючай Чырвонай арміі ў першыя месяцы пасля вызвалення аказвалі камсамольцы. Яны право-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзілі агітацыйна-паясняльную работу на вызваленай тэрыторыі, дапамагалі ваенкамату праводзіць мерапрыемствы па мабілізацыі мужчын у Чыровоную армію, утваралі маладзёжныя брыгады па аднаўленні чыгункі і шасейных дарог, рамонту мастоў, збору на палях бітваў зброі і г. д. 14 камсамольска-маладзёжных брыгад, утвораных Свіслацкім РК ЛКСМБ, прымалі актыўны ўдзел у рамонце будынкаў, у тым ліку школ, загатоўцы паліва на зіму. Гэту работу актыўна арганізаваў і ўзначаліў сакратар РК ЛКСМБ В. Ляпёшкін [4].

У жніўні 1944 г. была прынята пастанова ЦК ВКП(б) «Пра бліжэйшыя задачы партыйных арганізацый КП(б) Беларусі ў галіне масава-палітычнай і культурна-асветніцкай работы сярод насельніцтва». Рэалізуючы гэтую пастанову ў Свіслацкім раёне аднавілі работу Свіслацкая і Поразаўская бібліятэкі. У Свіслацкім клубе камсамольцы і моладзь арганізавалі два гурткі самадзейнасці, адкрылі ў раёне хаты-чытальні, праўда літаратуры вельмі не хапала. Пачала выходзіць раённая газета «За Родину», яе рэдактарам стаў былы партызан, супрацоўнік Ваўкавыскай падпольнай газеты Б. Р. Тронза. У кароткіх паведамленнях жыхарам расказвалася спачатку пра весткі з фронту, потым пра жыццё раёна, выкананне заданняў па пастаўцы арміі хлеба, фуражу, жывёлы, дапамогу транспартнікам і г. д. У 1949 г. у раёне працавалі кінатэатр і 2 кінаперасоўкі, былі дадзены 619 кінасеансаў, на якіх прысутнічалі 37 440 гледачоў.

Трэба адзначыць, што партыйнымі органамі ў пасляваенны перыяд значная ўвага надавалася выхаванню савецкага патрыятызму, асабліва ў заходніх абласцях Беларусі. У адпаведнасці з пастановай «Аб палітычнай рабоце сярод насельніцтва Гродзенскай вобласці», прынятай на Пленуме ЦК КП(б)Б у чэрвені 1945 г., партыйныя арганізаціі павінны былі «выхоўваць працоўных у духу адданасці сацыялістычнай Радзіме, … нястомна тлумачыць працоўным, што толькі дзякуючы дапамозе нашых рускіх братоў і ўсіх народаў СССР, звязаных у адно цэлае дружбаю, дасягнута вызваленне Беларусі ад іга нямецкіх акупантаў».

10 лютага 1946 г. у жыцці Свіслацкага раёна, як і ўсёй Беларусі, адбылася значная палітычная падзея – выбары ў Вярхоўны Савет СССР. Кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Савета

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

СССР першага пасляваеннага склікання па Гродзенскай выбарчай акрузе, куды ўваходзіў і Свіслацкі раён, былі вылучаны: у Савет Нацыянальнасцей – С. В. Прытыцкі, слухач Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК ВКП(б), у Савет Саюза – А. М. Рапецкая, сялянка з в. Губінка Скідзельскага раёна. 9 лютага 1947 г. адбыліся выбары дэпутатаў Вярхоўнага Савета БССР, 11 студзеня 1948 г. – мясцовых Саветаў Беларусі. У сувязі з гэтымі падзеямі жыхары раёна бралі абавязацельствы да дня выбараў датэрмінова выканаць планы па лесанарыхтоўках і інш. [1, с. 264].

Нягледзячы на цяжкасці, наладжвалася сельскагаспадарчая вытворчасць. Вядома, што ў 1948–1950 гг. у заходніх абласцях рэспублікі была праведзена калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Першая калектыўная гаспадарка ўзнікла яшчэ вясной 1945 г. побач са Свіслаччу на базе былога маёнтка, а потым доследнай станцыі, першым старшыней якой стаў І. А. Налівайка. Затым з'явіліся калгасы ў Ранявічах, Ражках, Дварчанах, Ліхасельцах, Нязбодзічах, Палонцах, Агародніках. Памылкай у гэтай справе было імкненне стварыць калгас амаль у кожнай вёсцы. Дробныя і маламагутныя гаспадаркі не маглі працаваць эфектыўна, бо не хапала тэхнікі, мінеральных угнаенняў, нельга было разлічваць на дапамогу МТС. У гэты час у калгасах раёна атрымлівалі з кожнага гектара па 6,6 ц збожжавых, 50 ц бульбы. Не выконваліся планавыя заданні па ўраджайнасці льну, цукровых буракоў і іншых культур. На адну фуражную карову надойвалі па 1099 кг малака.

У першым пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі раёна на 1946–1950 гг. прадугледжвалася павялічыць здабычу торфу для паліўных мэт, поўнасцю забяспечыць ім прамысловасць раёна, бальніцы, школы і іншыя установы, павялічыць пасяўную плошчу, пашырыць пасевы тэхнічных культур і цукровых буракоў, павялічыць пагалоўе коней, буйной рагатай жывёлы, авечак і свіней. У выкананні гэтага плана былі і поспехі. Многія працоўныя раёна перавыконвалі ўзятыя на сябе абавязацельствы. Так, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР у сувязі з 30-годдзем БССР старшыня калгаса імя Леніна А. П. Дудзенка і свінарка М. П. Цімафеева былі ўзнагароджаны медалём «За працоўную доблесць».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мясцовыя ўлады, выконваючы мерапрыемствы дзяржаўнай палітыкі, прымалі ўсе захады, каб людзі жылі больш заможна, каб раслі грашовыя даходы калгасаў, іх вытворчыя фонды, умацоўвалася іх матэрыяльна-тэхнічная база. Пытанні развіцця сельскай гаспадаркі, прамысловасці, будаўніцтва, транспарту сістэматычна разглядаліся на пленумах райкома партыі, пасяджэннях выканкама і сесіях раённага савета дэпутатаў працоўных, сходах партыйна-гаспадарчага актыву. Так, 20 ліпеня 1949 г. адбыўся раённы сход сялян, на якім былі ўзнагароджаны лепшыя працаўнікі сельскай гаспадаркі і абмеркаваны чарговыя задачы. З’езд заслухаў і абмеркаваў даклад сакратара райкома партыі Сухарукава «Вынікі XIX з’езда камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі і задачы сялян раёна» і даклад старшыні райваканкама Дарагенскага «Вынікі 1948 сельскагаспадарчага года і задачы на 1949 год». З’езд ад імя ўсіх сялян раёна прыняў сацыялістычныя абавязацельствы і выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва працаўнікоў сельскай гаспадаркі Бераставіцкага раёна. Калгасы самастойна вялі будаўніцтва гаспадарчых пабудоў, арганізоўвалі вытворчасць будаўнічых матэрыялаў (напрыклад, дахоўкі з цэменту), стваралі фізкультурныя калектывы (у 1949 г. іх налічвалась 20), арганізоўвалі нядзельнікі па будаўніцтву не толькі жылых і гаспадарчых пабудоў, але і фізкультурных пляцовак. 1 верасня 1949 г. у раёне гасцінна расчынілі дзверы 32 школы.

Значнай праблемай, якая перашкаджала станаўленню мірнага жыцця ў раёне, быў бандытызм. Асабліва актыўнічалі атрады Арміі Краёвай, якая ставіла сваёй мэтай барацьбу за аднаўленне Польшчы ў межах да верасня 1939 г. Бандыты нападалі на ваеннаслужачых Чырвонай Арміі, супрацоўнікаў НКУС-НКДБ, савецка-партыйны актыў, былых партызан, а таксама мясцовых жыхароў, якія падтрымалі савецкую ўладу. Ад рук бандытаў загінулі начальнік Свіслацкага райаддзела міліцыі П. В. Зайцаў, міліцыянеры С. Ц. Бажанаў, В. М. Кунец, Ц. Я. Мілееў, І. І. Мілешка, савецкія актывісты Ф. Р. Грыгор’еў, А. І. Кандрась, В. М. Матвейчык, А. У. Рудзін, М. А. Яромік і інш. У адказ органы мясцовага кіравання ўзмацнялі прапагандысцкую дзейнасць, дапамагалі сілавым структурам праводзіць чэкісцка-вайсковыя аперацыі, агентурна-апера-

РЕПОЗИТОРИЙ БрГУ КИ

тыўную і следчую работу. У выніку антысавецкаму падполлю быў нанесены адчувальны ўдар у 1944 і 1947 гг., а ў 1953 г. яно было поўнасцю знішчана.

Такім чынам, можна рэзюмаваць, што мясцовыя органы кіравання Свіслацкага раёна сваёй дзейнасцю садзейнічалі ўмацаванню беларускай савецкай дзяржаўнасці, вырашалі справы аднаўлення разбуранай вайною эканомікі, а жыхары раёна ў большасці сваёй даволі актыўна ўдзельнічалі ў аднаўленні мірнага жыцця ў першыя пасляваенныя гады, што дазволіла ў кароткі тэрмін залячыць ваенныя раны.

*1.* Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. Навука, 2012. – Кн. 2. – 654 с.

*2.* Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994–1995. – Ч. 2. – 1995. – 560 с.

*3.* Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 1377. Оп. 1. Д. 1. Л. 12–22.

*4.* Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 7. Оп. 3. Д. 1771.

*5.* Памяць : Свіслацкі р-н : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / рэдкал. І. І. Варанец [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 526 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Т. Ф. СУХОЦКАЯ

## АСВЕТНІЦКАЯ СКІРАВАНАСЦЬ ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЫ СТАРОГА УЛАСА

Вялікая роля ў стварэнні беларускай культурнай прасторы належыць знакамітым родам ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Многія з іх актыўна займаліся мецэнацкай дзейнасцю. Дзякуючы іх падтрымцы духоўная спадчына беларускага народа ўзбагацілася многімі выдатнымі асобамі, творчы патэнцыял якіх змог раскрыцца і рэалізавацца. Матэрыяльная і маральная дапамога графа Міхала Тышкевіча паспрыяла з’яўленню на небасхіле нацыянальнай культуры зоркі таленавітага беларускага збіральніка фальклору, паэта, публіцыста Уладзіслава Пятровіча Сівы-Сівіцкага (Старога Уласа).